**Установа адукацыі**

**“Мінскі дзяржаўны механіка-тэхналагічны**

**прафесійна-тэхнічны каледж”**

# Справаздача

# па тэме самаадукацыі

# “Развіццё роднай мовы на ўроках беларускай мовы і літаратуры”

Выкладчык беларускай мовы і літаратуры

Пятніца Вольга Уладзіміраўна

2021

## ЗМЕСТ


1. **Уводзіны**……………………………………………………………………...3
2. **Асноўная частка**……………………………………………………………..5
3. **Заключэнне**…………………………………………………………………12
4. **Спіс выкарыстанай літаратуры**…………………………………………15
5. **Дадаткі**…………………………………………………………………......25

# УВОДЗІНЫ

*Яно добра, а нават і трэба ведаць суседскую мову,*
*але найперш трэба ведаць сваю.* ***(Ф. Багушэвіч)***

Сучаснае грамадства прад’яўляе да чалавека ўсё больш высокія патрабаванні. Ва ўмовах росту сацыяльнай канкурэнцыі маладому чалавеку неабходна ўмець творча прымяняць тыя веды, уменні, навыкі, якімі ён валодае, умець дзейнічаць эфектыўна. Для таго, каб быць запатрабаваным грамадствам, неабходна быць крэатыўным, незаменным. А для гэтага трэба, каб дзейнасць насіла творчы характар. Грамадству неабходны людзі, якія валодаюць словам, умеюць абараніць свае перакананні, погляды, творча ўключыцца ў працэс міжасобаснай камунікацыі. Праблема развіцця маўлення навучэнцаў набывае ў наш час усё большае грамадскае значэнне, таму што маўленне з’яўляецца важным паказчыкам духоўнай культуры асобы. Падрыхтоўка маладых людзей высокай гуманітарнай культуры, здольных прымаць самастойныя рашэнні немагчыма без выхавання ў навучэнцаў усвядомленай любові да мовы, зацікаўленых адносін да яе.

Як сцвярджаецца ў Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, адным з асноўных кірункаў дзяржаўнай палітыкі ў сферы навучання з’яўляецца *“стварэнне неабходных умоў для задавальнення патрэб асобы ў адукацыі, патрэб грамадства і дзяржавы ў фарміраванні асобы”* (глава1, артыкул 2).

Для большасці навучэнцаў нашай краіны мовай, якую яны чуюць упершыню, з’яўляецца руская. Зараз узнікла такая сітуацыя, калі родная мова не з’яўляецца мовай дзіцячага мыслення. Навучэнцы сярэдніх навучальных устаноў (каледжаў, ліцэяў) у большасці выпускнікі рускамоўных школ, гімназій, і менавіта таму, яны  сутыкаюцца з вялікімі цяжкасцямі пры вывучэнні беларускай мовы і літаратуры, як у школах, так і працягваючы сваю далейшую адукацыю ў каледжы.

Мяне, як выкладчыка роднай мовы і літаратуры, увесь час непакояць такія пытанні, як зацікавіць навучэнцаў беларускай мовай, што зрабіць для таго, каб навучэнцы кожны раз адкрывалі для сябе нешта новае, лепш пазнавалі жыццё, былі не пасіўнымі сузіральнікамі падзей, а ішлі па жыцці з няўтомным жаданнем змяніць яго ў лепшы бок. Не выклікаюць цікавасці ў сучаснага навучэнца гатовыя веды, простыя пытанні, праблемы, якія не вымагаюць даследавання, удумлівага асэнсавання. Навучэнцу ў першую чаргу павінна быць цікава на ўроку.

Але як жа за невялікую колькасць вучэбных гадзін перадаць той аб’ём інфармацыі, які патрэбны для таго, каб сфарміраваць у навучэнцаў моўную, камунікатыўную, культуразнаўчую кампетэнтнасць, развіць пазнавальную дзейнасць? Якія ж прагрэсіўныя педагагічныя прыёмы і метады можна выкарыстоўваць на ўроках мовы і літаратуры з мэтай развіцця і фарміравання роднай мовы? На мой погляд, поспех у выкладанні мовы і літаратуры, глыбокія і якасныя веды ў навучэнцаў будуць тады, калі выкладчык на справе зможа зацікавіць навучэнцаў, калі сорак пяць хвілін - гэта кавалачак жыцця навучэнца і выкладчыка, які пражыты яскрава, эмацыянальна, актыўна, запамінальна, калі навучэнцы не заўважылі, што празвінеў званок.

Каб вырашыць пазначаныя праблемы, я звярнулася да вывучэння метадычнай літаратуры, да вопыту іншых настаўнікаў і выкладчыкаў. Гэта работы М.В. Жуковіча, М.Г. Яленскага, А.В. Руцкай, В.У Протчанкі, С.І. Цыбульскай, Г.М. Малажай.

**Мэта:**

*абагульніць свой вопыт работы па развіццю роднай мовы навучэнцаў на ўроках беларускай мовы і літаратуры*

Пры напісанні работы вырашаліся наступныя **задачы**:

1. вывучэнне і аналіз псіхолага-педагагічнай і навукова-метадычнай літаратуры па дадзенай праблеме;
2. аналіз методыкі развіцця роднай мовы на ўроках беларускай мовы і літаратуры і пазакласнай работы па прадмеце;
3. высвятленне эфектыўнасці прымянення разнастайных метадаў і прыёмаў, накіраваных на актывізацыю дзейнасці навучэнцаў, развіццё роднай мовы.

Істотным патрабаваннем сённяшняга дня лічу фарміраванне і развіццё ў навучэнцаў станоўчых матываў навучальна-пазнавальнай дзейнасці, інтарэсаў, творчай актыўнасці.

**Этапы рэалізацыі:**

**І этап:** *падрыхтоўчы.*

**Мэта:** стварыць умовы для вывучэння і сістэматызацыі нарматыўна-прававой дакументацыі, навукова-метадычнай літаратуры па выкарыстанню развіцця роднай мовы на ўроках беларускай мовы і літаратуры.

**ІІ этап:** *рэалізацыйны*

**Мэта:** прааналізаваць работу па развіццю роднай мовы на ўроках беларускай мовы і літаратуры, а таксама на пазаўрочных мерапрыемствах, зрабіць справаздачу па дадзенай тэме.

**III этап:** *заключны*

Прааналізаваць вынікі і вызначыць ход далейшай работы па актыўнаму развіццю роднай мовы на ўроках беларускай мовы і літаратуры.

**Вынікі, якія чакаю на працягу работы па дадзенай тэме:**

1. актыўна развіваць родную мову на ўроках беларускакй мовы і літаратуры і пазаўрочных мерапрыемствах;
2. павысіць матывацыю навучэнцаў да вывучэння роднай мовы;
3. павысіць якасць ведаў па вучэбных прадметах “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура”.

**План работы**
**па тэме самаадукацыі**
**“Развіццё роднай мовы на ўроках**
**беларускай мовы і літаратуры”**

1. Вывучэнне нарматыўна-плануючай дакументацыі

*верасень-снежань 2019-2020 навучальнага года*

2. Вывучэнне і аналіз псіхолага-педагагічнай і навукова-метадычнай літаратуры па дадзенай тэме (спіс літаратуры дадаецца)

*верасень-снежань 2019-2020 навучальнага года*

3. Сістэматызацыя матэрыяла (складанне канспектаў, табліц, афармленне папкі з апрацаваным матэрыялам і г.д.):
   - напісанне планаў-канспектаў вучэбных заняткаў па тэмах вучэбнай праграмы па вучэбным прадметам “Беларуская мова”, “Беларуская літаратура” з выкарыстаннем розных тэхнік і прыёмаў, якія накіраваны на развіццё роднай мовы.
   - падбор і апрацоўка матэрыялаў для папкі “Развіццё роднай мовы на ўроках беларускай мовы і літаратуры”

*студзень-чэрвень 2019-2020 навучальнага года*

4. Аналіз работы па дадзенай тэме ва ўстанове адукацыі (аналіз дакументацыі, назіранні, бяседы, анкетаванні і г.д.)

   - аналіз дакуметацыі каледжа па тэме самаадукацыі;
   - назіранне за навучэнцамі ў час правядзення вучэбных заняткаў, якія накіраваны для развіццё роднай мовы;
   - бяседы са слабапаспяваючымі і высокаматываванымі навучэнцамі з мэтай развіцця і ўдасканалення роднай мовы.

*2020-2021 навучальны год*

5. Метадычны прадукт
   - метадычная распрацоўка “Развіццё роднай мовы на ўроках беларускай мовы і літаратуры”;
   - выпуск памяткі “Родная мова – цудоўная мова!”.

*2020-2021 навучальны год*

6. Выкарыстанне ў практычнай дзейнасці:
   - выступленне на пасяджэнні метадычнай камісіі ў каледжы па тэме самаадукацыі;
   - удзел у арганізацыі і правядзенні гарадскіх мерапрыемстаў (семінары-практыкумы, інструктыўна-метадычныя сходы, пасяджэнні метадычных аб'яднанняў, канферэнцыі і г.д);
   - правядзенне індывідуальных і групавых кансультацый па дадзенай тэме.

*студзень-чэрвень 2020-2021 навучальнага года*

**Развіццё роднай мовы на ўроках беларускай мовы і літаратуры**

Многія думаюць, што ў кожнага навучэнца на першым месцы павінны быць такія паняцці як доўг, абавязкі, стараннасць. Безумоўна, гэта вельмі важныя стымулы навучання, але зацікаўленасць прадметам, любоў да роднай мовы дапамагае прывесці навучэнца да поспеху. Я думаю, што сягоння няма такога выкладчыка, які б не задумваўся над пытаннямі: «Як зрабіць урок цікавым, яркім? Як зацікавіць навучэнцаў сваім прадметам, прывіць любоў да роднай мовы? Як стварыць на ўроку сітуацыю поспеху для кожнага навучэнца?» Які выкаладчык не марыць аб тым, каб навучэнцы на яго ўроку працавалі дабравольна, творча. І гэта невыпадкова. Сёння галоўная мэта навучання - гэта не толькі назапашванне навучэнцамі пэўных ведаў, уменнняў, навыкаў, але і падрыхтоўка моладзі да самастойнага выбару ў жыцці. Як гаварыў Бернард Шоу: “Единственный путь, ведущий к знанию – деятельность».

За час работы ў школе і ў каледжы мною накоплены, можа, невялікі, але ўсё ж вопыт педагагічнай працы. Прыйшла да высновы, што ў многіх навучэнцаў адсутнічае пазнавальны інтарэс на ўроках беларускай мовы і літаратуры. Навучэнцы дрэнна размаўляюць на беларускай мове, ім цяжка думаць і разважаць па-беларуску. Менавіта таму я выбрала тэму сваёй самаадукацыі «Развіццё роднай мовы на ўроках беларускай мовы і літаратуры». Пры падрыхтоўцы да ўрокаў, імкнуся, каб новы ўрок не быў падобны да папярэдняга, планую работу на ўроку так, каб навучэнцы самастойна прыйшлі да таго ці іншага выніку. Думаю, што ўсе метады добрыя, якія стымулююць групу актыўна працаваць на ўроку, дапамагаюць хутка і надоўга засвоіць матэрыял. Я ўвесь час знаходжуся ў творчым пошуку, і мэта маёй работы - навучыць, зацікавіць, распаліць жаданне і імкненне вывучаць прадмет глыбей, валодаць роднай мовай добра, карыстацца ёй у паўсядзённым жыцці. У сваёй рабоце імкнуся праводзіць комплекснае навучанне: развіваю мову (маналагічную, дыялагічную, пісьмовую), мысленне, фарміру арфаграфічныя, пунктуацыйныя навыкі. Я лічу сваім абавязкам навучыць не толькі граматна пісаць, але і думаць, выказваць свае пачуцці. Галоўны прынцып работы выкладчыка – навучыць самастойна думаць і працаваць, навучыць вучыцца. Як паказвае практыка,

беларуская мова як прадмет, на жаль, не ва ўсіх навучэнцаў карыстаецца папулярнасцю. А выкладчык хоча, каб яго вучні добра вучыліся, з цікавасцю і жаданнем займаліся на занятках.

Вывучэнне мовы навучэнцы часта ўспрымаюць як збор арфаграфічных і пунктуацыйных правіл. Таму ў выкладанні беларускай мовы асобае значэнне набывае развіццё цікавасці да прадмета ў кожнага навучэнца. На маю думку, адна з галоўных задач выкладчыка-прадметніка - вывучыць пазнавальны інтарэс, вызначыць шляхі фарміравання зацікаўленасці на ўроках беларускай мовы і літаратуры.

Узнікненне пазнавальнага інтарэсу залежыць ў першую чаргу ад узроўню развіцця навучэнца, яго вопыту, ведаў, а з другога боку, ад спосабу падачы матэрыялу. Пры наяўнасці пазнавальных інтарэсаў вучэнне становіцца блізкай, жыццёва значнай дзейнасцю, у якой сам навучэнец зацікаўлены. Такім чынам, можна зрабіць выснову, што кожны выкладчык-прадметнік павінен спачатку зацікавіць навучэнцаў, падаць матэрыял так, каб на ўроку была актыўная, зацікаўленая праца. Калі так адбудзецца, тады можна рабіць выснову таго, што навучэнцы будуць размаўляць на роднай мове, карыстацца ёй у паўсядзённым жыцці. Толькі ў гэтым выпадку ён можа разлічваць на поспех. Каб навучэнцы былі зацікаўлены размаўляць на роднай мове на ўроках беларускай мовы і літаратуры, і каб работа была прадуктыўнай, я выкарыстоўваю на працягу ўрока розныя віды дзейнасці. ***На ўроках беларускай мовы:***

*1. Розныя віды дыктантаў.* Слоўнікавыя, выбарчыя дыктанты – выкарыстоўваюцца для замацавання ці паўтору арфаграм. Праверачныя і кантрольныя дыктанты – выкарыстоўваюцца для бягучага ці выніковага кантролю ведаў. Тлумачальныя і папераджальныя дыктанты – выкарыстоўваюцца пры вывучэнні любой арфаграфічнай тэмы ў мэтах папярэджання памылак. Свабодныя і творчыя дыктанты. Іх мэта - развіццё звязнай мовы і пашырэнне запасу слоў.

*2. Работа з тэкстам на ўроку* – цікавы і займальны від дзейнасці. Засваенне розных спосабаў работы з тэкстам на ўроках беларускай мовы накіравана на фарміраванне ўдумлівай, граматнай, творчай, кампетэнтнай асобы навучэнца.

*3. Работа з апорнымі схемамі і табліцамі* – дазваляе вывучыць ці абагульніць тэму. Іх нагляднасць уплывае на якасць запамінання матэрыялу. Дзякуючы чаму ў навучэнцаў развіваецца мова мыслення.

*4. Арфаграфічныя хвілінкі* (дадатак 1)

Накіраваны на развіццё граматнай пісьмовай мовы навучэнцаў.

**На ўроках літаратуры:**

*1.Творчыя заданні* - усе цікавыя па-свойму, развіваюць мастацкае, даследчае, вобразнае мысленне.

*2. Работа з тэкстам на ўроку* – гэта займальны від дзейнасці, які падыходзіць як для ўрока мовы, так і для ўрока літаратуры. Працуючы з тэкстам, навучэнцы фармулююць тэму, ідэю мастацкага твора, знаёмяцца са сродкамі выразнасці мовы, вызначаюць кампазіцыю, рыфму і памер (калі гэта вершаваны твор), адчуць настрой аўтара. Калі гэта эпічны твор, то звяртаецца ўвага на асаблівасці ўспрыняцця і вывучэння эпічных жанраў (раман, аповесць, апавяданне, байка і г.д.).

*3. Выразнае чытанне* – накіравана на ўзаемасувязь чытання і аналізу літаратурнага твора і, безумоўна, на развіццё эстэтычнага густу навучэнцаў, уменне разумець задумку аўтара. Мая дзейнасць накіравана на развіццё і выхаванне чалавека-даследчыка, чалавека-творцы з цвёрдай грамадзянскай пазіцыяй. Выкладчык і навучэнцы, у маім разуменні, - гэта суб'екты сумеснай дзейнасці, накіраванай на дасягненне запланаваных вынікаў. Лічу, што выкладчык павінен умець прадугадваць і паспяхова фарміраваць асобасныя якасці навучэнцаў, тады прадметныя навыкі, якія фарміруюцца, робяцца сузалежнымі. Важнейшымі паказчыкамі работы выкладчыка лічу веды, якія даюць выпускнікам магчымасць паступаць у ВНУ, а таксама іх актыўную жыццёвую пазіцыю, грамадзянскую адказнасць, творчы патэнцыял, высокія матывы і пазнаваўчыя патрэбнасці. Лічу, што сучаснаму педагогу неабходна пастаянна асвойваць новыя тэхналогіі і радаваць навучэнцаў цікавымі ўрокамі. Сёння наспела неабходнасць у выкарыстанні на ўроках і пазаўрочнай дзейнасці такіх тэхналогій, дзякуючы якім можна выхаваць творчую, самастойную, інтэлектуальна развітую асобу, якая знаходзіцца ў працэсе пастаяннай самаадукацыі. Ідучы ў нагу з часам, звяртаюся да розных педагагічных тэхналогій. Тым не менш, асновай з'яўляецца традыцыйны ўрок, які можна ўпрыгожыць элементамі новых педагагічных тэхналогій.

**У сваёй дзейнасці я выкарыстоўваю элементы наступных сучасных педагагічных тэхналогій:**

1. асобасна-арыентаванае развіццёвае навучанне;

2. тэхналогія даследчай дзейнасці навучэнцаў (за 2019-2020 навучальны год маю пэўныя вынікі па выкарыстанню дадзенай тэхналогіі. Дыплом ІІІ ступені на міжнародных краязнаўчых чытаннях, якія адбыліся ў красавіку 2020 года. Пераможцы – Харчук Ульяна (група № 903 с), Хайдараў Артур (група № 903 с). Даследая работа, прысвечаная Г.П. Загурскай “Постаці слаўныя краю майго”;
3. праблемнае навучанне;
4. гульнёвыя тэхналогіі;
5. тэхналогія рознаўзроўневага навучання. Увогуле, я лічу, што педагог не павінен замыкацца ў межах толькі адной тэхналогіі навучання, бо гэта значна звужае выбар метадаў і прыёмаў навучання. Стварэнне сітуацыі выбару лічу адной з важнейшых педагагічных умоў станаўлення індывідуальнасці навучэнца. Лічу, што толькі ў тым выпадку, калі навучэнец усвядоміць сэнс вучэбнай ці выхаваўчай задачы і прыме яе як асабіста для яго важную, яго дзейнасць стане матываванай, мэтанакіраванай і паспяховай. Навучэнец павінен адчуваць сябе прафесіяналам на ўроку, г. зн. валодаць неабходнымі ўменнямі і навыкамі.

Узроўневую дыферэнцыяцыю работы навучэнцаў імкнуся арганізоўваць на ўроках усіх тыпаў, максімальна ўлічваючы індывідуальныя асаблівасці кожнага ў групе. Навучэнец павінен умець аналізаваць сваю дзейнасць, а выкладчык павінен стварыць умовы для ўсведамлення навучэнцамі сябе ў дзейнасці. Да тэм, якія цяжка засвоіць навучэнцам, складаю ***“разумныя” карткі***, якія садзейнічаюць лепшаму засваенню вучэбнага матэрыялу, дазваляюць хутка паўтарыць тэарэтычны матэрыял пры падрыхтоўцы да ўрока ці кантрольнай работы.

На ўроках літаратуры часта звяртаюся да такіх прыёмаў, як ***“крокавая дыскусія”, “перакрыжаваная дыскусія”***, якія дапамагаюць працаваць з тэкстам у цэлым (на ўзроўні яго ідэі і праблематыкі). Гэтыя прыёмы даюць магчымасць, з аднаго боку, пазбегнуць адназначнага тлумачэння падзей, учынкаў і характараў герояў, а з другога – вучаць паважаць чужое меркаванне.

Для фарміравання і развіцця пазнавальнай актыўнасці навучэнцаў звяртаюся да метаду ***эксперыменту*** (калі навучэнцы сутыкаюцца з праблемнай сітуацыяй, то самі вызначаюць, які матэрыял не ведаюць і што павінны паўтарыць для вывучэння новай тэмы, складаючы алгарытм для вырашэння вучэбнай задачы). Акрамя таго, дазваляю здольным навучэнцам

пабываць у ролі выкладчыка: растлумачыць новую тэму, ацаніць работу іншых навучэнцаў. Лічу, што на канкрэтным уроку добры вынік можа быць атрыманы толькі за кошт забеспячэння ўзаемасувязі ўсіх вышэй названых кампанентаў.

Перад выкладчыкам роднай мовы і літаратуры ўсё часцей паўстаюць пытанні: як пабудаваць урок так, каб зацікавіць навучэнцаў, зрабіць іх не пасіўнымі гледачамі, а актыўнымі ўдзельнікамі навучальнага працэсу? Чым кіравацца, каб урок роднай мовы стаў адкрыццём новага, незабыўнага і цікавага? Пры падрыхтоўцы і правядзенні ўрока я выкарыстоўваю асобныя метады, прыёмы і сродкі тэхналогіі ўзроўневай дыферэнцыяцыі .

Мэты ўрокаў абумоўлены патрабаваннямі вучэбнай праграмы і асаблівасцямі канкрэтнай групы, накіраваны на фарміраванне агульнавучэбных і спецыяльных уменняў і навыкаў, разумовае развіццё і выхаванне і ў цэлым на развіццё асобы.

Асаблівае значэнне надаю мэтам выхаваўчым і развіццёвым. Тут мэтавызначэнне накіравана на засваенне навучэнцамі гуманістычных каштоўнасцей, норм маральных паводзін, на развіццё іх творчых, даследчых, камунікатыўных, рэфлексіўных здольнасцей і г.д. Асаблівую ролю ў дадзеным выпадку адводжу ўрокам літаратуры. Варыятыўнасць форм і метадаў работы, выкарыстанне розных элементаў тэхналогій не толькі робяць урок markazнабаковым, але і эфектыўна павышаюць працэс навучання, аптымізуючы пазнаваўчую дзейнасць вучняў на ўроку за кошт змены відаў работы, павышэнне тэмпу ўрока, змяншэнне напружанасці. Сучасных падлеткаў не заўсёды задавальняе роля пасіўных слухачоў на ўроку. Яны чакаюць нестандартных форм знаёмства з новым матэрыялам, дзе маглі б выявіцца іх актыўнасць і творчы характар мыслення. Упэўнена, што ўрок беларускай мовы магчыма зрабіць цікавым і змястоўным пры ўмове, што выкладчык выбірае такія формы, метады і прыёмы работы, якія садзейнічаюць актыўнаму ўдзелу навучэнцаў у пазнавальным працэсе, скіроўваюць да актыўнай дзейнасці.

**Прымальным для сябе, з пункту погляду выкладчыка-філолага, лічу наступныя метады:**

1. ***тлумачальна-ілюстрацыйны***;
2. ***рэпрадуктыўны***;
3. ***праблемны;***
4. ***даследчы*** і інш.

Гэтыя метады забяспечваюць тэхналагічнасць працэсу фарміравання ведаў і ўменняў, развіццё пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў.

**На ўроках практыкую розныя формы дзейнасці:**

- ***работа ў парах і групах***;
- ***індывідуальныя творчыя заданні***;
- ***віктарыны;***
- ***работа з тэкстам;***
- ***самастойная работа з падручнікам і дадатковай літаратурай;***

**У сваёй рабоце побач з традыцыйнымі формамі выкарыстоўваю такія формы ўрокаў як**:

- ***урок-гульня;***
- ***урок-падарожжа;***
- ***праблемны ўрок;***
- ***урок-залік і інш.***

Для дасягнення аптымальных вынікаў ствараю на розных этапах урока сітуацыі выбару і поспеху, каб даць магчымасць кожнаму навучэнцу атрымаць заслужаную ім ацэнку яго працы. На арганізацыйна-матывацыйным этапе ўрока задачу арганізацыі ўвагі стараюся вырашаць у цікавай для навучэнцаў форме, стварыць рабочую абстаноўку для далейшай дзейнасці. Актыўна выкарыстоўваю арфаграфічныя хвілінкі, крыжаванкі. Да вызначэння мэт і задач дзейнасці стараюся падвесці так, каб навучэнцы маглі самастойна іх сфармуліраваць. Для гэтага практыкую стварэнне праблемнай сітуацыі, арганізацыю пошукавай дзейнасці (арганізуецца вучэбны дыялог: прапаноўваю розныя меркаванні па пэўнай праблеме, а потым звяртаюся з пытаннем: “А як думаеце вы?”) Падтрымку ўвагі і актыўнасці навучэнцаў, ажыццяўленне адваротнай сувязі “навучэнец-выкладчык” пры паўтарэнні тэарэтычнага матэрыялу ажыццяўляю з дапамогай сігнальных карт. На пастаўленае пытанне адказвае адзін навучэнец, а ўсе астатнія сігнальнай карткай павінны паказаць выкладчыку, ці ведаюць яны адказ. Такі метад франтальнага апытання забяспечвае ўдзел кожнага навучэнца ў вуснай працы. Змест і форма арганізацыі работы на аперацыйна-пазнаваўчым этапе ўрока залежыць ад тыпу ўрока, узроўню падрыхтаванасці навучэнцаў і г.д., але заўсёды імкнуся спланаваць работу так, каб забяспечыць максімальна магчымую актыўнасць у групе.

Напрыклад, на ўроку вывучэння новага матэрыялу выкарыстоўваю праблемна-пошукавы метад, працу па зададзенаму алгарытму,

інтэрактыўны метад “мазгавы штурм”, працу ў групах, і інш. На ўроку замацавання і паглыблення ведаў гэта можа быць актыўная самастойная работа навучэнцаў з рознаўзроўневымі заданнямі, франтальная работа з найбольшым ахопам навучэнцаў з мэтай дыягностыкі і карэкцыі засваення новага матэрыялу. Дзейнасць навучэнцаў на ўроку арганізоўваю такім чынам, каб на ўроку яны не толькі нешта пазналі новае, але і развілі свае рэфлексіўныя здольнасці, каб на кожным этапе ўрока кожны мог ацаніць сябе ва ўласнай дзейнасці: настроіць сябе на ўрок, самаспланаваць сваю работу, правесці самааналіз сваіх ведаў, слухаючы адказы іншых навучэнцаў, сумець самаарганізаваць сябе ў дзейнасці і ажыццявіць самакантроль. (дадатак 2)

Развіццю ўвагі навучэнцаў, іх гатоўнасці ўмяшацца і імгненна зрэагаваць на памылкі садзейнічае гульня ***“Лаві памылку!”*** Работу па абмеркаванні памылак і іх прычын звычайна арганізую ў парах. Супрацоўніцтва і ўзаемадапамога ствараюць добрую эмацыянальную атмасферу і садзейнічаюць развіццю камунікатыўных здольнасцей навучэнцаў. Асаблівую ўвагу надаю рэфлексіі, якая садзейнічае развіццю рэфлексіўных здольнасцей, павышэнню вучэбнай матывацыі і лепшаму засваенню вучэбнага матэрыялу. Гэта можа быць метад незакончаных сказаў, сінквейн, ***“Пісьмо самому сабе”***, выказванні па крузе і інш. Аналізуючы праведзены ўрок, стараюся выявіць, што ўдалося і што не ўдалося рэалізаваць з таго, што было задумана, шукаю рэзервы далейшага ўдасканалення арганізацыі адукацыйнага працэсу.

*Дадаткі*

## *Дадатак 1*

## *Арфаграфічныя хвілінкі*

***1.Граматычнае сіта***

Размяркуйце словы ў два слупкі (у,ў)

Рады…с, а..л,каля ..рны, царква …ніяцкая, са…на, тра…р, ма…зер, ток-шо…,

ва …збекістане, ва …ніверсітэце.

(адказы) Радыус, аул,каля ўрны, царква ўніяцкая, саўна, траур, маўзер, ток-шоу, ва

Узбекістане, ва ўніверсітэце.

***2.Стол даведак***

Траўлер - спецыяльнае судна для лоўлі рыбы

Аўтсайдар - спартсмен або каманда, якія занялі ў спаборніцтвах адно з апошніх

месцаў

Пакгаўз - склад для грузаў пры чыгуначных портах

Бакштоў - канат, які выпускаецца з кармы для буксіравання суднаў (пішацца ў, бо

слова зменнае)

(Растлумачце правапіс у,ў)

***4.Лінгвістычная задача***

Смаргонь == смаргонскі

…. == марсельскі

Чэрвень == ……

…. == тайванскі

Цянь –Шань== …..

…. == хатынскі

Восень == …..

….. == казанскі

**5. Лінгвістычнае заданне**

Пры дапамозе суфіксаў утварыце прыметнікі.

Праезд, скорасць, кантраст, помста, колькасць, выезд, шчасце, вобласць.

(адказы) праязны, скарасны, кантрасны, помслівы, колькасны, выязны, шчаслівы,

абласны.

***6.Папрацуем перакладчыкамі***

Кронштадт, поздний, капустный, вощение, милосердный, песчаный, безжалостный,

треснутый, сердце, солнце, крещение, счастливец, брусчатый.

(адказы) Кранштат, позні, капусны, вашчына, міласэрны, пясчаны, бязжаласны,

трэснуты, сэрца, сонца, хрышчэнне, шчасліўчык, брусчаты.

***7.Творчая лабараторыя***

Устанавіце адпаведнасць паміж рускімі і беларускімі прыказкамі.

| | |
|---|---|
| А. Голодному Федоту и пустые щи в охоту.<br>Б. Хвастала овца, что у неё хвост, как у жеребца.<br>В. Обжегшишь на молоке, будешь дуть и на воду.<br>Г. Глаза видали, что покупали.<br>Д.В ногах правды нет.<br>Е. Богат Ермошка: завёл кота да кошку.<br>Ж. Был конь, да изъездили. | 1.Хвалíся рэдз..ка, што з мёдам смачная.<br>2. Сядз..ма на калодзе, пагаворым аб прыгодзе.<br>3. Апарыўся на капус..це ў гаршку, то іна гародзе дз..мухаў.<br>4. Быў кон.., ды з..езджаны, быў хлеб, ды з..едзены.<br>5. У вераб…я багатая сям…я: у кожнага верабейкі па тры капейкі.<br>6. З гора, з бяды пад..еў лебяды.<br>7. Бачылі вочы, што бралі, а цяпер плач..це, хоць павылаз..це. |

**Дадатак 2**

Прапаную навучэнцам скласці сінквейн і выказаць свае адносіны да верша “Родныя вобразы”.

Прыклад сінквейна:

Беларусь

Сінявокая, светлая

Люблю, цаню, аберагаю

Вечна квітней мая зямля!

Радзіма (сінонім)

***Урок-практыкум па тэме «Прыметнік»***

**Мэта:**

- паглыбіць і сістэматызаваць веды навучэнцаў па асноўных пытаннях тэмы; удасканальваць уменні адрозніваць прыметнікі ў тэксце, выяўляць іх сэнсаваграматычную ролю, даваць марфалагічную і словаўтваральную характарыстыку;
- удасканальваць арфаграфічныя навыкі;
- выкарыстоўваць стылістычныя і выяўленчыя магчымасці прыметнікаў ва ўласных вусных і пісьмовых выказваннях;
- выхоўваць любоў і павагу да роднай мовы, да Радзімы.

**Тып урока:** урок-практыкум па тэме “Прыметнік” (з выкарыстаннем камп’ютара) па тэхналогіі рознаўзроўневага навучання.

**Форма правядзення:** індывідуальная, групавая работа, гульня.

**Абсталяванне:** Беларуская мова: Падручнік для 10 кл. агульнаадукац. шк. з бел. мовай навучання; “Тлумачальны слоўнік беларускай мовы”, дыдактычны матэрыял, камп’ютар, ПМК “Беларуская мова”, мультымедыйны праектар.

***Эпіграфы:***

*“Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога даная”. Ф. Багушэвіч*

*“Беларуская мова мілагучная, ласкавая, як песня...” І. Мележ*

**Ход урока**

**І. Арганізацыйны момант**

**а) Уступнае слова**: - Добры дзень! Сябры, давайце паглядзім адзін на аднаго добрымі вачыма і ўсміхнёмся. А цяпер за працу! Уважліва слухаем.

**б) Два навучэнцы чытаюць на памяць вершы:**

| | |
|---|---|
| ***Адкрываю, як, свет, нанова, беларускае роднае слова,***<br>***Пералівістае – як праменчык,***<br>***Вясёлкавае – як ручэй,***<br>***Цёплае – як агеньчык добрых тваіх вачэй,***<br>***Светлае – як маланка,***<br>***Гнеўнае – як Пярун,***<br>***Ціхае – як калыханка,***<br>***Вечнае – як Беларусь!***<br>***Анатоль Канапелька*** | **Ільняная і жытнёвая. Сялянская.**<br><br>**Баравая ў казачнай красе.**<br><br>**Старажытная. Ты самая славянская.**<br><br>**Светлая, як травы у расе.**<br><br>**Вобразная, вольная, пявучая,**<br><br>**Мова беларуская мая!** |

Вы праслухалі вершы А. Канапелькі і П. Панчанкі.

- Ці спадабаліся яны вам ?
- Што аб’ядноўвае гэтыя творы?
- Якія часціны мовы пераважаюць у вершах?
- Якую ролю выконваюць прыметнікі?
- Якая ж наша мова?

**ІІ. Паведамленне тэмы і мэты ўрока**

- Сапраўды, наша мова “вобразная, вольная, пявучая”. Менавіта пад такой назвай пройдзе наш сённяшні ўрок-практыкум па тэме “Прыметнік”. У нас сёння вельмі адказны момант. Мы павінны паказаць, чаму навучыліся, што ведаем і ўмеем. Я жадаю вам поспехаў у працы.

- Якія задачы ўрока? (навучэнцы фармулююць задачы ўрока, выкладчык удакладняе)

-На ўроку мы зможам яшчэ раз упэўніцца ў тым, што наша “беларуская мова, як сказаў І. Мележ,- мілагучная, ласкавая, як песня...”

**ІІІ. Узнаўленне засвоеных напярэдадні тэарэтычных ведаў**

- Успомніце, над якімі пытаннямі мы працавалі на папярэдніх уроках?
- Чым адрозніваецца прыметнік ад назоўніка як часціны мовы?

- У чым асаблівасці марфалагічных прымет роду, ліку, склону прыметніка і назоўніка?

- Якія асноўныя сінтаксічныя функцыі ўласцівы прыметніку і назоўніку?

- Ці адрозніваецца сэнсава-стылістычная роля прыметніка і назоўніка ў тэксце?

- Выдзеліце 1-2 праблемныя пытанні, якія былі найбольш цяжкімі пры вывучэнні прыметніка?

**IV. Замацаванне ведаў, уменняў, навыкаў.**

**Заданне 1 (на III узровень)**

- Прачытайце выразна верш

Прыйдзіце, словы, да мяне,
Трывалыя, Прачулыя,
Разумныя, Ласкавыя,
Для ўсіх вас праца знойдзецца і справа... С. Дзяргай

- Ці выразна быў прачытаны верш?

- Назавіце прыметнікі і растлумачце іх канчаткі.

- Вызначце марфалагічныя прыметы прыметнікаў.

- Вызначце разрад прыметнікаў.

- Падумайце і адкажыце, у якіх сітуацыях вам могуць спатрэбіцца словы “трывалыя, прачулыя (шчырыя), разумныя, ласкавыя”?

**Заданнне 2 ( на V узровень)**

**Гульня “Карэктар”**.

- Навучэнец выконваў заданне і зрабіў памылкі ў сказе. Праверце і выпраўце іх. Растлумачце, чаму яны дапушчаны. (Сказ знаходзіцца на экране камп’ютара і запісаны з памылкамі)

Як ты дорага мне, мая родная мова!
Мілагучнае, звонкае, спеўнае слова!
Н. Гілевіч

- Зрабіце вусны марфалагічны разбор прыметніка (на выбар)

- Знайдзіце ў сказе кароткі прыметнік і вызначце яго сінтаксічную ролю.

- Дайце характарыстыку сказу.

**Заданне 3**

**Творчы дыктант ( на IV узровень)**

- Выканаем творчы дыктант. Праверым, хто з вас самы пісьменны? Ваша задача замяніць словазлучэнні “наз.+наз.” сінанімічнымі словазлучэннямі “прым.+наз.”

Кніга Скарыны, песня маці, казка бабулі, словы Купалы, наказ бацькі, паэма Коласа, вершы Багдановіча, шапка дзядулі, сшытак Паўла.

Узаемаправерка: навучэнцы абменьваюцца сшыткамі і звяраюць запісы з правільным варыянтам

(-Да якога разраду адносяцца запісаныя прыметнікі?

- Што мы павінны памятаць пра ўтварэнне прыналежных прыметнікаў?

- Як пішуцца прыналежныя прыметнікі, утвораныя ад уласных назоўнікаў?

**V Фізкультпаўза (гучыць музыка)**

- Якая гучала музыка? Адкажыце, ужываючы прыметнікі.

**Заданне 4. Праца з тэкстам ( на V узровень)**

Наш беларускі паэт і пісьменнік Я. Колас заўсёды клапаціўся аб чысціні беларускага слова. Правядзём лінгвістычны бой. (Практыкаванне 282) Навучэнец чытае тэкст. Затым навучэнцы адзін аднаму задаюць пытанні па тэксце:

- Якая тэма тэксту?
- Якая асноўная думка?
- Да якога стылю адносіцца тэкст?
- Які тып мовы?
- Якую ролю ў тэксце выконваюць прыметнікі?
- Растлумачце знакі прыпынку ў апошнім сказе.

**Выкладчык:**

У тэксце сустрэліся незнаёмыя словы? Ці ведаеце вы іх значэнне?

Вам дапаможа **"Тлумачальны слоўнік"**. Адшукайце гэтыя словы і растлумачце іх значэнне (навучэнцы тлумачаць значэнні слоў)

**Заданні:**

**I варыянт**: утварыце ўсе магчымыя ступені параўнання прыметнікаў, якія вы знайшлі ў тэксце

**II варыянт**: зрабіце словаўтваральны разбор слоў найпрыгажэйшы, невялікія. (1 навучэнец выконвае на дошцы)

**VI. Падагульненне.**

- Ці выканалі мы задачы ўрока?
- Што вам даў сённяшні ўрок мовы?

**VII. Рэфлексія**.

- Я хачу расказаць вам адну прытчу: Тры чалавекі вязуць каляскі з цяжкімі камянямі.
- Што вы робіце? – пытаюцца ў іх.
- Валаку гэтыя праклятыя камяні,- адказвае першы.

- Зарабляю сабе на хлеб,- гаворыць другі.
- Я буду будаваць сабе храм, - кажа трэці. Калі перанесці гэту прытчу на наш урок, то скажыце, чым была для вас праца на ўроку – цяжкай працай? Вы працавалі дзеля адзнакі, пахвалы? А можа, вы будавалі храм? Мне здаецца, што я, слухаючы вашы адказы, будавала храм, а вашы выказванні былі цаглінкамі для яго падмурку (выкладчык памяшчае фішку на плакаце, дзе намаляваны храм). Я таксама прапаную вам выбраць месца на плакаце для сваёй фішкі (акрамя храма на плакаце намаляваны грошы і груда камянёў).

**VIII. Каменціравнне і выстаўленне адзнак.**

**IX. Дамашняе заданне:** на III-IV узровень – па падручніку, на V узровень напісаць нататку ў каледжную газету пра сённяшні ўрок.

## Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Арлова, А.Г. Мець свой стыль навучання / А.Г.Арлова // Беларуская мова і літаратура—2009.—№5.—С.38-41.

2. Босы, І.Ч. Актывізацыя пазнавальнай дзейнасці праз дыферэнцыяцыю навучання / І.Ч.Босы // Беларуская мова і літаратура –2007.— №4.—С.3-7.

3. Выкарыстанне сучасных адукацыйных тэхналогій на ўроках беларускай мовы і літаратуры / В.У.Быхавец і інш.; пад агул.рэд. С.І.Цыбульскай.—Мн.: Сэр-Віт, 2006.—208 с. –Майстэрня настаўніка.

4. Кныш, М.А. Развіваць асобу вучня / М.А.Кныш // Беларуская мова і літаратура—2009.—№5.—С.36-38.

5. Лазарук, М.А. Навучанне і выхаванне творчасцю: пед.роздумы і пошукі / М.А.Лазарук.—Мінск: Нар.асвета—1994.—200с.

6. Нівяркевіч, С.І. Арганізацыя самастойнай пазнавальнай дзейнасці на ўроках беларускай літаратуры/ С.І.Нівяркевіч // Беларуская мова і літаратура—2008.—№5.—С.12—18.

7. Руцкая, А.В. Новыя формы ўрокаў па беларускай літаратуры/ А.В.Руцкая // Беларуская мова і літаратура—2011.—№11.—С.44—47.